За каментарый у інтэрнеце – 2 гады абмежавання волі

09.02.2022



Вікторыя Касцючэнка. Фота: https://bit.ly/3oVW99v

Жыхарка аграгарадка Жгунь Добрушскага раёна **Вікторыя Касцючэнка** прыгаворана да 2 год абмежавання волі за каментарый у інтэрнеце, які суд палічыў зняважлівым у адносінах да міліцыянта.

У яе доме 7 траўня 2021 г. правялі вобыск, падчас якога былі выняты ноўтбук і мабільны тэлефон. Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, пры іх аглядзе ў той жа дзень было выяўлена, што **Вікторыя Віктараўна Касцючэнка** 27 лістапада 2020 г. размясціла ў адкрытым доступе ў адным з канал-чатаў месенджара «Тэлеграм» зняважлівы каментарый пад фатаздымкам **Жаўняка А. І.** Сам фатаздымак і асабістыя даныя адлюстраванага на ім прадстаўніка ўлады былі размешчаны ў канал-чаце невызначанай асобай. 6 верасня 2021 г. у **Вікторыі Касцючэнкі** быў выняты сотавы тэлефон з сім-карткай. З 14 па 17 верасня 2021 года яна была затрымана і знаходзілася пад вартай.

У якасці доказаў выкарыстоўваліся таксама дакументы аб тэлефонных злучэннях **Вікторыі Касцючэнкі**, яе выхадзе ў інтэрнет і наведанных інтэрнет-рэсурсах за 26 – 27 лістапада 2020 г. як у сотавай тэлефоннай сувязі, так і ў сувязі, прадастаўляемай Гомельскім філіялам РУП «Белтэлекам».

Жаўняк Арцём Мікалаевіч – участковы інспектар міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі аддзела ўнутраных спраў адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Гомеля, капітан міліцыі.

Суд Чыгуначнага раёна г. Гомеля 8 лютага прызнаў **Вікторыю Касцючэнку** вінаўнай па артыкуле 369 Крымінальнага кодэкса РБ – «Знявага прадстаўніка ўлады». Суддзя **Парэмскі Яраслаў Ігаравіч** з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы **Купрацэвіч А. І.** вызначыў, што грамадзянка размясціла каментарый па матывах палітычнай варожасці. На меркаванне суддзі, публічная знявага прадстаўніка ўлады была здзейснена ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў.

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

Вікторыя Касцючэнка віну прызнала часткова. Яна патлумачыла, што хутчэй за ўсё, праглядаючы каментарыі пад фатаграфіяй **Жаўняка А. М.**, прачытаўшы негатыўныя водгукі ў адносінах да супрацоўніка міліцыі, на эмоцыях магла пакінуць зняважлівы каментарый, аднак за даўніною часу гэтага не памятае.

Абмежаванне волі прызначана з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Акрамя таго, суддзя часткова задаволіў грамадзянскую позву **Жаўняка А. І.** аб выплаце яму грашовай кампенсацыі маральнай шкоды і спагнаў з **В. Касцючэнкі** 2000 рублёў; яна абавязана таксама выплаціць дзяржаўную пошліну ў памеры 96 руб., а рэчавыя доказы – ноутбук і мабільны тэлефон – канфіскаваны.

На час вынясення прыгавору **Вікторыя Касцючэнка** працавала выкладчыкам матэматыкі ў таварыстве з абмежаванай адказнасцю «НеШкола» г. Гомеля. Яна метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, пераможца абласнога этапа рэспубліканскага конкурса прафесійнага майстэрства «Настаўнік года». Раней працавала ў Гомельскім абласным інстытуце развіцця адукацыі, а да гэтага – у гімназіі г. Светлагорска.

Аўтар: **Г. Краўчэня**

Гомельская вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ


08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ



ПАРТНЁРЫ

Радыё Свабода · Народная Воля · ВЯСНА праваабарончы цэнтр · kamunikat · Наша Ніва · Белорусский документационный центр · Центр стратегической тяжбы

Праваабарончыя сайты: Брэст · Віцебск · Гародня · Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com